Mìchnevìč, Arnol'd Jafìmavìč

# Семантычныя дыферэнцыяльныя прызнакі і структура сказа

In: *Otázky slovanské syntaxe. II, Sborník symposia "Strukturní typy slovanské věty a jejich vývoj", Brno 20.-22.10.1966.* Bauer, Jaroslav (editor). Vyd. 1. Brno: Universita J.E. Purkyně, 1968, pp. 51-55

Stable URL (handle): https://hdl.handle.net/11222.digilib/120042
Access Date: 27. 11. 2024
Version: 20220831

Terms of use: Digital Library of the Faculty of Arts, Masaryk University provides access to digitized documents strictly for personal use, unless otherwise specified.

MUNI ARTS Masarykova univerzita Filozofická fakulta

Digital Library of the Faculty of Arts, Masaryk University
digilib.phil.muni.cz

А. Я. МІХНЕВІЧ (Мінск)

# СЕМАНТЫЧНЫЯ ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНЫЯ ПРЫЗНАКІ І СТРУКТУРА СКАЗА

0.1. Сінтаксіс як навука працяглы час характарызаваўся, а ў значнай ступені працягвае характарызавацца, дыспрапорцыяй паміж нязмернай колькасцю прыватных назіранняў і даследаванняў і нешматлікасцю прац, прысвечаных асэнсаванню сабранага матэрыялу і шырокім абагульненням. Гэта колькаснае адрозненне можа быць інтэрпрэтавана як адрозненне паміж пераважна эмпірычным сінтаксісам, меўшым галоўным прадметам вывучэння тыпы злучэнняў слоў (тыпы словазлучэнняў), і сінтаксісам тэарэтычным, асноўнай задачай якога з'яўляецца высвятленне заканамернасцей спалучальнасці слоў (заканамернасцей словаспалучальнасці). Проціпастаўленне эмпірычнага сінтаксіса і сінтаксіса тэарэтычнага адноснае, як, дарэчы, і любое іншае проціпастаўленне. Аднак на даным этапе яно, несумненна, карыснае, бо зусім ясна, што адно толькі далейшае накапленне прыватных назіранняў не прывядзе да рашучага паглыблення, а ў шэрагу выпадкаў і перагляду існуючых сінтаксічных уяўленняў. Навуковая індукцыя саступае месца дэдуктыўнаму падыходу, г. зн. гіпотэзам, наперадзе ў якіх — адстойваць свае правы ператварыцца ў сінтаксічную тэорыю. Зразумела таксама, што гэты новы этап у развіцці сінтаксіса не можа не абапірацца на вынікі, дасягнутыя эмпірычным сінтаксісам, мовазнаўствам у цэлым, а таксама на здабыткі некаторых навук, сумежных з мовазнаўствам.

0.2. Сведчаннем актыўнага развіцця тэарэтычнага сінтаксіса служыць шырокае выкарыстанне лінгвістычнага эксперымента, у тым сэнсе гэтага слова, як яго разумеў і адстойваў адзін з выдатных мовазнаўцаў-тэарэтыкаў Л. У Шчэрба. Сама магчымасць эксперыментавання ў лінгвістыцы, як і ў навуцы наогул, узнікае толькі тады, калі выпрацаваны гіпотэзы, якія патрабуюць эксперыментальнай праверкі, г. зн. пры развіцці тэарэтычнай, абагульняючай думкі.

0.3. Непасрэдным вынікам і разам з тым сведчаннем пераканцэнтрацыі сінтаксічнай думкі з праблемы словазлучэнняў і іх таксанамізацыі на праблему словаспалучальнасці і яе заканамернасцей з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы ўжытак паняцця адзначанасці. Гэта чыста сінтаксічнае ці, правільней, сінтагматычнае паняцце — сінонім, па сутнасці сваёй, паняцця спалучальнасці. Аналіз неадзначаных фраз розных тыпаў пераканаўча паказаў недастатковасць існуючых сінтаксічных ведаў, паколькі ўзнікла неабходнасць растлумачыць не толькі тое, як звязаны два ці больш элементаў, але — што асабліва важна для пазнання сінтаксічных законаў — чаму не спалучаюцца два іншых элементы.

Увядзенне паняцця адзначанасці пацягнула за сабой цэлы шэраг новых

праблем, прычым не толькі сінтаксічных. А пастаноўка новых праблем — гэта пярэдадне новых ідэй, новых гіпотэз.

На гэтым можна скончыць кароткі ўступ, які павінен служыць аўтару апраўданнем яго спробы выкласці адну з магчымых гіпотэз аб заканамернасцях пабудовы сказа як заканамернасцях спалучальнасці слоў, — у першую чаргу, стасоўна да славянскіх моў.

1.1. Сістэматызацыя мноства (паўназначных) слоў, якая мае на мэце ўскрыць і апісаць іманентную семантычную сістэму, а не проста прагматычна ,,ўпарадкаваць" лексіку, павінна абапірацца на наяўнасць двух тыпаў сістэм у мове:

1) Сістэм, якія выводзяцца з сінтагматычных (сінтаксічных) структур;

2) Сістэм, якія не выводзяцца з сінтагматычных (сінтаксічных) структур.

1.2. Паколькі членамі абодвух тыпаў сістэм з'яўляюцца адны і тыя ж адзінкі, а іменна моўныя знакі, (паўназначныя) словы, пастолькі натуральна лічыць, што гэтыя сістэмы функцыянальна розныя і — як вынік — што яны грунтуюцца на функцыянальна розных аспектах значэння слова: сістэмы першага тыпу заснаваны на элементах значэння слова, звязаных з яго спалучальнасцю, г. зн. вызначаюцца камунікатыўнай функцыяй слова — яго здольнасцю быць складаючай, інтэгрантам паведамлення; сістэмы другога тыпу, не выводзімыя са структур, маюць у сваёй аснове элементы значэння слова, звязаныя з яго прадметна-лагічнай суаднесенасцю, г. зн. вызначаюцца намінатыўнай функцыяй слова — яго здольнасцю быць фіксатарам, канстантай пазнанага.

1.3. Значэнне слова — гэта яго ,,план зместу" у цэлым, г. зн. — у прынятых тэрмінах — і лексічнае, і граматычнае значэнні. Паколькі слова мае дзве асноўныя — камунікатыўную і намінатыўную — функцыі, значэнне яго расслойваецца, спецыялізуецца ў розных сваіх частках у адпаведнасці з гэтымі функцыямі. Яно ператвараецца ў складаную структуру, што і дазваляе гаварыць аб элементах значэння слова.

2.1. Дзвюм асноўным функцыям слова адпавядаюць два ,,ярусы" у структуры яго значэння:

1) Ярус рэферэнтнага значэння, г. зн. тая ,,частка" значэння слова, якая дазваляе суадносіць даны гукавы комплекс з данай рэаліяй-рэферэнтам і ўтварае аснову значэння слова як элемента намінатыўнай сістэмы;

2) Ярус структурнага значэння, г. зн. тая ,,частка" значэння слова, якая прадвызначае яго месца ў сінтаксічнай структуры і канстытуіруе слова як элемент камунікатыўнаў сістэмы.

2.2. У ярус структурнага значэння ўваходзяць, але не вычэрпваюць яго, граматычныя значэнні. Гэты ярус значэння слова ў славянскіх мовах, аб'яднаных прынцыповай агульнасцю марфалагічнай будовы, чляніцца на два пад'ярусы:

1) Пад'ярус грамемных значэнняў, г. зн. значэнняў, якія маюць спецыялізаванае марфемнае выражэнне;

2) Пад'ярус немарфалагізаваных значэнняў, якія мы ўмоўна назавём камбінантнымі значэннямі. Наяўнасць апошніх у слове вызначаецца фармальна з дапамогай дыстрыбуцыйна-трансфармацыйных аперацый.

2.3. Адрозненне паміж ярусамі, г. зн. паміж рэферэнтным і структурным значэннем, адлюстроўвае адрозненне паміж функцыямі слова і мае, на нашу думку, універсальны характар.

Адрозненне паміж пад'ярусамі (у межах структурнага значэння) адлюстроўвае спецыфіку флектыўных моў і, будучы істотным для характарыстыкі значэння слова ў гэтых мовах, не мае статусу ўніверсаліі.

2.4. Паколькі наяўнасць пад'ярусаў структурнага яруса ў славянскіх мовах абавязковая, мэтазгодна ў далейшым гаварыць аб трох асобных частках у структуры значэння слова: рэферэнтнай, камбінантнай і грамемнай. Замена дыхатаміі „лексічнае значэнне — граматычнае значэнне" трыхатаміяй „рэферэнтнае значэнне — камбінантнае значэнне — грамемнае значэнне" прынцыпова важнае, таму што дазваляе сканцэнтраваць увагу на семантыка-сінтаксічнай спалучальнасці слоў і, у рэшце рэшт, наблізіцца да вызначэння абавязковых элементаў у будове сказа.

3.1. Сістэма — гэта мноства, элементы якога ўпарадкаваны па пэўнаму закону. Семіятычныя сістэмы грунтуюцца на проціпастаўленні ўтвараючых іх элементаў і апісваюцца пры дапамозе набору дыферэнцыяльных прызнакаў гэтых элементаў.

3.2. Намінатыўная семантычная сістэма, у аснове якой ляжыць намінатыўная функцыя слова і якую можна разглядаць як мноства рэферэнтных значэнняў, ёсць не што іншае, як адлюстраваная ў чалавечай свядомасці, структураваная мовай і стаўшая моўнай рэчаіснасцю рэчаіснасць рэальная. Карэлятам намінатыўнай сістэмы з'яўляецца пазамоўная рэчаіснасць, „сістэма" рэалій, вычарпальная моўная таксанамізацыя якой у прынцыпе немагчыма. Намінатыўная сістэма з'яўляецца адкрытай і ў пэўным сэнсе ўмоўнай. „Клетачкай" намінатыўнай сістэмы можна лічыць семантычную мікрасістэму, якая складаецца з аднаго немаркіраванага і аднаго маркіраванага элементаў, якія знаходзяцца ў адносінах прыватыўнай апазіцыі (*ножык — складанчык*, *stół — biurko*, *куче — копбй* і г. д.). Семантычная мікрасістэма захоўвае ўсе асноўныя ўласцівасці намінатыўнай сістэмы і можа служыць сродкам вывучэння розных груповак слоў, якія звычайна падаюцца ў якасці пацвярджэння наяўнасці сістэмнасці ў семантыцы. Дыферэнцыяльныя прызнакі элементаў намінатыўнай сістэмы служаць для адрознівання рэалій. Паколькі іх задачай з'яўляецца фіксацыя адрозненняў паміж самімі рэаліямі, яны могуць выступаць у яўным выглядзе, г. зн. могуць стаць знакамі (*складанчык = складаны ножык*, *biurko = stół do pisania*, *копбй = ловно куче* і г. д.). Нейтралізацыя семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў у намінатыўнай сістэме, з прычыны характару гэтай сістэмы і, у прыватнасці, таму, што яна „несінтагматычна", з'яўляецца нейтралізацыяй пазамоўнай, сітуацыйнай.

3.3. Спалучальнасць слоў на ўзроўні рэферэнтных значэнняў для натуральнай мовы не можа быць зафіксавана сукупнасцю правіл, бо яна вызначаецца, залежыць ад спалучальнасці ўяўленняў аб пазамоўнай рэчаіснасці, абумоўленых і абмежаваных грамадскім вопытам носьбіта мовы і моўнага калектыву ў цэлым. Паняцце адзначанасці на ўзроўні рэферэнтных значэнняў інтэрпрэтуецца як асэнсаванасць. Незалежнасць рэферэнтнай спалучальнасці ад мовы, яе пазамоўны характар пераканаўча пацвярджаецца магчымасцю „прэзумпцыі асэнсаванасці", г. зн. падборам, падгонкай, прыстасаваннем рэальнай ці ірэальнай сітуацыі да фразы. Заўважым, што „прэзумпцыя граматычнасці", відаць, прынцыпова немагчыма.

3.4. Камунікатыўная семантычная сістэма не можа складацца непасрэдна з моўных знакаў — слоў, таму што колькасць апошніх нязмерна пераўзы-

ходзіць колькасць семантыка-сінтаксічных пазіцый у сінтаксічнай структуры. Слова ўваходзіць у камунікатыўную сістэму не непасрэдна, а толькі праз клас ізафункцыянальных слоў. Такім чынам на ўзроўні структурных (камбінантных і грамемных) значэнняў проціпастаўляюцца не асобныя словы, а класы слоў. Карэлятам камунікатыўнай сістэмы служыць моўная рэчаіснасць. Дыферэнцыяльныя прызнакі класаў слоў адрозніваюць уласна словы, дакладней, значэнні моўных знакаў, і таму самі знакамі той жа мовы быць не могуць. Яны ўтвараюць метамову для апісання камунікатыўнай сістэмы, падобна да таго, як самі знакі можна з пэўнымі дапушчэннямі разглядаць як метамову для апісання ,,мовы рэчаіснасці'' Нейтралізацыя дыферэнцыяльных прызнакаў у камунікатыўнай сістэме адбываецца ў сінтагматыцы, г. зн. у патоку маўлення, і не залежыць ад пазамоўных фактараў.

3.5. Сцвярджаючы, што класы слоў, г. зн. камунікатыўная сістэма, з'яўляюцца вынікам функцыянальна-сінтагматычнай дыферэнцыяцыі слоў, мы тым самым сцвярджаем, што параджэнне новых фраз носьбітам мовы, г. зн. кожны новы акт злучэння слоў, з'яўляецца вынікам ведання камунікатыўнай сістэмы мовы ці, іншымі словамі, ведання спалучальнасці слоў.

3.6. Спалучальнасць слоў на ўзроўні структурных значэнняў можа быць зафіксавана ў зводзе правіл, паколькі яна вызначаецца ўнутрымоўнымі заканамернасцямі і залежыць ад ,,моўных уяўленняў'' (ад ведання мовы), а не ад уяўленняў аб рэальнай рэчаіснасці (ад ведання рэчаіснасці). Паняцце адзначанасці на ўзроўні структурных значэнняў інтэрпрэтуецца, папершае, для грамемных значэнняў як граматычнасць фразы, г. зн. як тая ступень яе ,,правільнасці'', якая залежыць ад спалучальнасці грамемных значэнняў (параўн.: *цікавая кніга* і **цікавых кнігу*). Граматычнасць фармальна вызначаецца правіламі сумеснай сустракальнасці марфем-флексій і апісваецца ў выглядзе правіл кіравання, дапасавання, прымыкання і пад.

Па-другое, — і гэта самае галоўнае, бо закранае сферу, зусім не вывучаную, — для камбінантных значэнняў адзначанасць павінна інтэрпрэтавацца як камбінантнасць фразы. Растлумачым паняцце камбінантнасці прыкладам. Абсалютна адзначанымі (г. зн. асэнсаванымі, камбінантнымі і граматычнымі) з'яўляюцца фразы *кніга брата, вымярэнне плошчы* і пад. Патэнцыяльна асэнсаванымі і камбінантнымі, але неграматычнымі будуць фразы **кніга братам*, **вымярэнне плошчу*. Патэнцыяльна асэнсаванымі і граматычнымі ў межах разглядаемай фармальна-граматычнай структуры ,,назоўнік + назоўнік роднага склону'', але некамбінантнымі аказваюцца фразы **дуб таўшчыні*, **дзяўчына прыгажосці*, **ідэя глыбіні* і аналагічныя. Неадзначанасць гэтых фраз тлумачыцца моўнымі прычынамі. Яна залежыць ад камбінантных значэнняў спалучаемых слоў. Стасоўна да прыведзеных прыкладаў можна сфармуляваць наступнае правіла: не спалучаюцца ў канструкцыі ,,назоўнік + назоўнік роднага склону'' класы назоўнікаў, проціпастаўленыя па камбінантных дыферэнцыяльных семантычных прызнаках ,,носьбіт неад'емнай уласцівасці'' — ,,неад'емная ўласцівасць''

Некамбінантнымі з'яўляюцца і наступныя фразы: **ярасна спаць*, **хутка вісець* (не спалучаюцца дзеясловы стану з прыслоўямі — ,,інтэнсіфікатарамі''); **зялёныя бескаляровыя ідэі*, **чырвоныя жаданні* (не спалучаюцца колеравыя прыметнікі і абстрактныя назоўнікі). Ва ўсіх гэтых выпадках мы маем права гаварыць аб структурных (камбінантных) значэннях і моўнай неспалучальнасці і не маем права гаварыць аб лексічных (рэферэнтных)

значэннях і лексічнай неспалучальнасці, таму што неспалучальнасць уласціва не асобным словам, а цэлым класам слоў. Зразумела, што эмпірычнае ўстанаўленне неспалучальных класаў слоў можа быць толькі самым пачаткам, толькі подступам да вызначэння камунікатыўнай сістэмы мовы. Трэба падкрэсліць таксама, што з прычыны таго, што рэферэнтнае, камбінантныя і грамемныя значэнні слова ўтвараюць кантынуум, прычыны неспалучальнасці могуць тлумачыцца па-рознаму.

4.1. У адпаведнасці з трыма часткамі ў структуры значэння слова і трыма тыпамі неадзначанасці (неасэнсаванасці, некамбінантнасці, неграматычнасці) у кожнай фразе можна зафіксаваць тры аспекты, тры ярусы яе семантычнай будовы: рэферэнтную (сэнсавую) структуру, якая, відаць, не павінна ўключацца ў сінтаксічнае апісанне мовы; камбінантную структуру, ці семантыка-сінтаксічную мадэль фразы; грамемную структуру, ці фармальна-граматычную схему фразы.

4.2. Семантыка-сінтаксічная мадэль і фармальна-граматычная схема фразы могуць быць інтэрпрэтаваны як дыстрыбутыўныя ланцужкі адпаведна камбінантных і грамемных семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў слоў, што ўтвараюць фразу.

4.3. Семантычныя дыферэнцыяльныя прызнакі, на якія ,,раскладаецца" структурнае значэнне слова, могуць стаць адным з магчымых сродкаў унутрымоўнай інтэрпрэтацыі вынікаў трансфармацыйнага аналізу, паколькі кожная трансфармацыя ў плане выражэння па сутнасці сваёй ёсць адначасова і пэўная трансфармацыя ў плане зместу, і заключаецца апошняя ў перагрупоўцы, у перадыстрыбуцыі ,,элементарных сэнсаў", ці семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў, у сукупнасці складаўшых усё значэнне зыходнай канструкцыі.

5.1. Да ліку пытанняў, якія маюць асаблівае значэнне ў святле выкладзенай канцэпцыі, трэба аднесці пытанне аб суадносінах семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў намінатыўнай сістэмы і семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў камунікатыўнай сістэмы; аб суадносінах семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў і часцін мовы; аб суадносінах семантычных дыферэнцыяльных прызнакаў і членаў сказа.

## SEMANTIC DISTINCTIVE FEATURES AND THE STRUCTURE OF THE SENTENCE

The main objective of syntax is to study the rules of the combinability of words. The combinability of words depends upon their meanings. In accordance with three parts in the structure of the meaning of the word (referent, combinative and grammemic), it is possible to distinguish for each phrase three layers (strata) of its semantic structure: the referent structure, which should not be included into the syntactic description of the language, the semantico-syntactical model of the phrase and the formal-grammatical pattern of the phrase. The semantico-syntactical model and the formal-grammatical pattern can be interpreted as chains of combinative and grammemic semantical differential features, respectively, of words forming a phrase.